УДК 947,6

***В.П. Гарматны***

# ЗАКАНАДАЎЧАЯ БАЗА ПРАВЯДЗЕННЯ КАМАСАЦЫІ НА ЗЕМЛЯХ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1919-1939 гг.

У артыкуле распавядаецца пра заканадаўчае афармленне палітыкі польскіх улад у Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. па правядзенні камасацыі – звядзенні раскіданых сялянскіх надзелаў у адзін з пераняcеннем сюды хаты і сельскагаспадарчых будынкаў і стварэнні такім чынам хутара. Камасацыя ажыццяўлялася перш за ўсё на базе законаў ад 31 ліпеня 1923 г. аб правядзенні камасацыі і ад 14 студзеня 1927 г. аб выдачы хутаранам ільготных крэдытаў і спрыяла станаўленню ў аграрнай сферы капіталістычных адносін і стварэнню моцных, эканамічна самастойных сялянскіх гаспадарак.

## Уводзіны

У плане правядзення польскімі ўладамі аграрнай рэформы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. прадугледжвалася камасацыя (ліквідацыя цераспалосіцы), што фактычна азначала ажыццяўленне хутарызацыі. Паводле дадзеных сельскагаспадарчага перапісу ад 30 верасня 1921 г., у сярэднім па ІІ Рэчы Паспалітай колькасць гаспадарак, у якіх налічвалася па 6–10 раскіданых зямельных надзелаў, складала 23,5% [2, с. 196]. Асабліва вялікаю цераспалосіца была ва ўсходніх ваяводствах, таму правядзенне хутарызацыі было жыццёва неабходным [5, с. 32]. Як прыклад надзвычай высокай цераспалосіцы можна адзначыць вёску Матуйзы-Блондзішкі Лідскага павета Навагрудскага ваяводства, сялянскія гаспадаркі якой звычайна распадаліся на 20–30 невялікіх зямельных надзелаў [14, s. 56].

10 ліпеня 1919 г. Заканадаўчы Сейм (Ustawodawczy Sejm) па прапанове ўрада на чале з Ігнацы Янам Падарэўскім пасля працяглай гарачай дыскусіі большасцю ўсяго ў адзін голас прыняў «Прынцыпы зямельнай рэформы і аддзяржаўлення лясоў» [4, с. 25] – першы закон па аграрным пытанні ў ІІ Рэчы Паспалітай. Закон прадугледжваў стварэнне хутароў і прырэзку зямлі карлікавым гаспадаркам з вызначаных памешчыцкіх маёнткаў, прычым агульная плошча надзела не павінна была перавышаць 25 маргоў (14 гектараў) [6, с. 59]. Кошт зямлі не называўся, аднак мясцовым уладам пры вызначэнні яго прадпісвалася прымаць пад увагу не толькі «вытворчую вартасць» зямлі, але і вартасць пасеваў, меліярацыйныя работы і г.д. Уладальнікі самастойных гаспадарак пры магчымасці ўносілі плату наяўнымі, а малазямельныя сяляне маглі атрымаць ільготную дзяржаўную пазыку.

Закон ад 10 ліпеня 1919 г. насіў дэкларатыўны характар, не быў апублікаваны ў дзяржаўным друкаваным органе «Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej» і таму не меў абавязковай сілы, але асноўныя яго палажэнні атрымалі працяг у наступных законах польскіх улад па аграрным пытанні, і таму ён стаў першым этапам заканадаўчага афармлення ўрадавай палітыкі хутарызацыі.

15 ліпеня 1920 г., падчас найбольшай небяспекі для існавання польскай дзяржавы, калі Чырвоная Армія стаяла пад сценамі Варшавы і пад пытаннем было само існаванне незалежнай рэспублікі, Сейм у хуткім парадку, нават без абмеркавання, аднагалосна прыняў новы, больш радыкальны закон аб зямельнай рэформе – «Выканаўчыя правілы да закона аб зямельнай рэформе ад 10 ліпеня 1919 г.», якія прадугледжвалі надзяленне зямлёю малазямельных і беззямельных сялян праз выкуп яе за палову рынкавага кошту: 80% утвараемага зямельнага фонду прызначалася менавіта для гэтых сялян. Першынство ў набыцці зямлі адводзілася інвалідам вайны, сельскагаспадарчым рабочым і малазямельным сялянам, меркавалася аказанне ім вялікай дапамогі ў форме ільготных крэдытаў дзеля набыцця зямлі [5, с. 34].

31 ліпеня 1923 г. Сеймам II Рэчы Паспалітай прыняты закон аб правядзенні камасацыі (ссялення, scalenia) [15], у адпаведнасці з якім надзелы аднаго ўладальніка, даўжыня якіх ў адносінах да шырыні складала менш як 15 разоў і аддзеленыя адзін ад аднаго надзеламі іншага ўладальніка, лічыліся раздробленымі і цераспалоснымі і падлягалі звядзенню ў адзін, адпавядаючы асновам справядлівага гаспадарання (артыкул 1).

Ад правядзення ссялення пазбаўляліся наступныя землі:

а) лясы, якія знаходзіліся ў карыстанні лясной гаспадаркі і ў адносінах да якіх не было спрэчкі аб ўсталяванні межаў;

б) землі, на якіх размяшчаліся каменаломні альбо вялася здабыча мінералаў;

в) землі, якія належалі гутам (шклозаводам) і шахтам;

г) землі, на якіх размяшчаліся радовішчы нафты і г.д., маглі падлягаць ссяленню толькі са згоды ўладальніка;

д) землі, на якіх знаходзіліся помнікі гісторыі, архітэктуры, прыроды і г.д. (артыкул 2).

Без згоды ўладальніка пад ссяленне не падпадалі наступныя землі:

а) землі пад будынкамі і падворкамі;

б) землі, якія належалі прамысловым прадпрыемствам;

в) землі, якія знаходзіліся ў гарадах і мястэчках і на якіх планавалася распачаць будаўнічыя работы;

г) землі, якія патрэбны для вядзення гаспадаркі, а таксама пад вадаёмамі, якія выкарыстоўваліся для развядзення рыбы альбо для прамысловых мэт, і замена ці перамена спосабу выкарыстання якіх наносіла ўладальніку шкоду;

д) агароды і сады, якія вяліся планава, паркі і звярынцы;

е) землі з залежамі торфу;

ж) землі, абнесеныя сцяною;

з) вінаграднікі альбо хмельнікі плошчаю не менш за 1/4 га (артыкул 3) [7, s. 6].

Землі, якія ва ўмовах свайго месцазнаходжання, маглі выклікаць небяспеку праз засыпванне, абрыў берагоў і г.д., таксама вызваляліся ад ссялення (артыкул 4).

Пералічаныя ў артыкуле 1 землі ўтваралі абшар ссялення, які мог адпавядаць адміністрацыйнай адзінцы ці складаць яе частку. У выпадку неабходнасці абшар ссялення мог складаць некалькі адміністрацыйных адзінак альбо іх частак (артыкул 5). Кожны з удзельнікаў ссялення атрымліваў з абшару ссялення надзел зямлі, прыкладна роўны папярэдняму (артыкул 6). Ініцыятарам правядзення ссялення маглі быць уладальнікі не менш як 25 га, падпадаючых пад артыкул 1, а калі абшар ссялення не перавышаў 200 га – не менш за 1/10 зямлі (артыкул 14). Просьбы аб правядзенні ссялення падаваліся ў павятовую зямельную ўправу [5, с. 39], якая павінна была на месцы высветліць сапраўдны стан рэчаў, і – у выпадку патрабаванняў іншых органаў улады – запраектаваць абшар ссялення, які з гаспадарчых і тапаграфічных поглядаў належыць праводзіць адначасова (артыкул 15). Пасля гэтага просьбу аб ссяленні разглядала павятовая зямельная ўправа, якая на сваім пасяджэнні згодна кадастравым кнігам зацвярджала абшар ссялення альбо адвяргала яго (артыкул 16). Правадзейнае рашэнне акруговай зямельнай камісіі павінна было быць даведзена да ведама бакоў і шырокай грамадскасці (артыкул 17).

На падставе рашэння аб правядзенні ссялення і пастановы акруговай зямельнай управы зямельны камісар для кожнай ніжэйшай адміністрацыйнай адзінкі вызначаў асобныя выбары рады (савета) ссялення (rada uczestników scalenia), а ўладальнікі памешчыцкіх зямель вылучалі свайго прадстаўніка. Колькасць членаў рады залежала ад колькасці сялян вёскі і складала ад 3 да 7 членаў, у дапамогу якім выбіраліся намеснікі (zastępcy)ў колькасці членаў рады (артыкул 18) [7, s. 22–23].

Сход удзельнікаў ссялення ініцыіраваў і ўзначальваў войт гміны альбо солтыс (стараста) вёскі. На сходзе павінна была прысутнічаць не менш як 1/2 асоб, якія мелі права голасу, рашэнні прымаліся звыклаю большасцю галасоў. У выпадку сумеснага карыс-

тання зямлёю на сход вылучалася адна асоба з ліку гаспадароў, а ў выпадку, калі згода не будзе дасягнута, з паўнамоцных уладальнікаў – старэйшы па ўзросце, з тых, хто не мае права голасу, – іх законны прадстаўнік, ад загінуўшых – вызначаны судом куратар, адсутнічаючых – іх прадстаўнік, які ўпаўнаважаны зямельным камісарам, у выпадку немагчымасці прысутнасці ўладальнікаў – асоба, спецыяльна вызначаная судом па прапанове зямельнага камісара. У выпадку спрэчак па ўладальніку зямлі за ўпаўнаважанага да галасавання належаў апошні ўладальнік зямлі (артыкул 19).

У выпадку невыканання ў тэрміне 14 дзён, вызначаным зямельным камісарам, выбары членаў рады ссялення і іх намеснікаў, акруговая зямельная ўправа вызначала іх па прапанове зямельнага камісара. Пры сцвярджэнні, што дзейнасць асобных членаў альбо ўсёй рады ссялення не адпавядае вызначаным законам аб ссяленні мэтам, акруговая зямельная ўправа магла падаць на разгляд зямельнаму камісару прапанову аб вызваленні ад абавязкаў асобных членаў рады ссялення ці аб яе поўным роспуску. У такіх умовах акруговая зямельная ўправа прызначала новыя выбары альбо вызначала з ліку ўдзельнікаў ссялення новых членаў рады (артыкул 20).

У залежнасці ад абставін рада ссялення валодала рашаючым ці дарадчым голасам. Рада ссялення мела рашаючы голас, калі справа заходзіла аб:

1) усталяванні межаў выдзяляемых зямельных надзелаў, лугоў, лесу і г.д., што раней належалі ўсёй вёсцы;

2) выбары членаў ацэначнай камісіі (komisji szacunkowej), якая вызначала каэфіцыент ураджайнасці і грашовай вартасці камасаваных зямель;

3) удзеле хутаран у судзе і іншых камісіях, у якіх разглядалася пытанне правядзення ў вёсцы камасацыі;

4) утварэнні камісіі па меліярацыі;

5) завярэнні ўмовы на выкананне работ па меліярацыі;

6) вырашэнні розных гаспадарчых і адміністрацыйных пытанняў;

7) патрэбе замены грунтоў з мэтаю ўпарадкавання зямельных межаў і скасавання «анклаваў».

Дарадчы голас рада ссялення мела пры:

1) усталяванні землямерам межаў камасаваных грунтоў;

2) вызначэнні з ліку ўдзельнікаў ссялення гаспадарак, якія маюць патрэбу ў дадатковай зямлі;

3) вызначэнні зямель, якія не падлягаюць камасацыі;

4) праектаванні накірунку дарог, якія вядуць да новых надзелаў і каля якіх будуць стаяць гаспадарчыя будынкі;

5) узгадненні з землямерам і акруговай зямельнай управай праекта ссялення;

6) усялякіх іншых справах, якія ўзнікалі падчас работы землямера.

У функцыі рады ссялення ўваходзілі дапамога і нагляд за правядзеннем землямерам работ па камасацыі і адпаведнасцю выдзяляемых сялянам надзелаў, падбор рабочых з ліку мясцовых сялян для дапамогі землямеру ў выкананні неабходных работ. Ажыццяўляць сваю дзейнасць рада ссялення павінна была ў межах дзеючага заканадаўства пры выказванні ўласных пажаданняў. За ігнараванне сваіх абавязкаў ці нядбайнае іх выкананне членам рады ссялення пагражаў вялікі штраф (артыкул 21).

Для ацэнкі грашовай вартасці сялянскіх зямель пры ссяленні ствaралася ацэначная камісія (komisja szacunkowa), у склад якой уваходзілі:

а) зямельны камісар або падкамісар, спецыяльна дэлегаваны акруговаю зямельнаю ўправаю, – у якасці старшыні;

б) землямер, які праводзіў работы па ссяленні;

в) мінімум трое асабіста не зацікаўленых у выніках ссялення асоб, якія ведалі мясцовыя зямельныя адносіны.

Пры вырашэнні ацэначнаю камісіяй спрэчных пытанняў дарадчы голас мелі:

а) члены мясцовай рады ссялення;

б) дэлегаты іншых навакольных рад ссялення, якія знаходзіліся ў гэтай жа адміністрацыйнай адзінцы, – па два ад кожнай рады;

в) прадстаўнік ссяляемых памешчыцкіх зямель – па адным ад кожнага надзела.

Вынікі працы ацэначнай камісіі павінны былі быць зафіксаваны ў пратаколе і на плане, змешчаным у справе ссялення (артыкулы 25, 26).

Пры правядзенні камасацыі ў выпадку неабходнасці ажыццяўляліся:

а) ліквідацыя ўсялякіх сервітутаў (права сумеснага зямельнага карыстання);

б) падзел зямель ці ў выпадку немагчымасці з гаспадарчых альбо тапаграфічных прычын урэгуляванне іх карыстання;

в) усталяванне межаў адміністрацыйных адзінак альбо іх частак;

г) выдзяленне зямель на грамадскія мэты;

д) меліярацыя ссяляемых зямель для іх рацыянальнага выкарыстання;

е) рэгуляцыя дарог, даездаў праз давядзенне іх да стану звычайнага карыстання;

ж) парцэляцыя (падзел) прыватных маёнткаў у межах закона аб аграрнай рэформе, калі таго патрабавалі гаспадарчыя патрэбы ссяляемых зямель;

з) усталяванне агульнага плана забудавання, складзенага на падставе ссялення адміністрацыйнай адзінкі (артыкул 7).

Правядзенне ссялення належала да кампетэнцыі зямельных управаў (артыкул 9). Тэхнічнае ажыццяўленне камасацыі зямельныя ўправы даручалі дзяржаўным альбо прыватным землямерам, якія валодалі адпаведнаю кваліфікацыяй. Кантроль над ажыццяўленнем ссялення ажыццяўляў старшыня Галоўнай зямельнай управы II Рэчы Паспалітай (ГЗУ, Główny Urząd Ziemski) (артыкул 10). Нагляд за ссяленнем зямельныя ўправы праводзілі бясплатна, а пералічаныя ў артыкуле 7 работы – платна ў адпаведнасці з вызначанымі тарыфамі [1, с. 136].

У выпадках, калі гаспадар надзелу не мог аплаціць неабходныя работы і гэта пацвярджалі мясцовая гмінная ўправа і павятовае староства, яму мог быць выдадзены крэдыт тэрмінам на 5 гадоў на частковую ці поўную аплату работ. Працэнтная стаўка па крэдыце складала ад 4% да 100% штогод (артыкул 11).

Сяляне, якія павінны былі ў вызначаныя зямельнымі ўправамі тэрміны перанесці свае будынкі на новыя надзелы альбо правесці меліярацыю зямель, не маглі атрымаць крэдыт, які перавышаў палову кошту ссяляемых зямель. Выдачу крэдытаў ажыццяўляў міністр фінансаў па ўзгадненні са старшынёю ГЗУ (артыкул 13) [15].

Такім чынам, закон аб камасацыі ад 31 ліпеня 1923 г. прадугледжваў стварэнне ў Заходняй Беларусі эканамічна моцных, самастойных, рынкава арыентаваных сялянскіх гаспадарак фермерскага тыпу, пераход мясцовых аграрных адносін на капіталістычную аснову і быў несумненна прагрэсіўным.

28 снежня 1925 г. Сейм II Рэчы Паспалітай прыняў новы закон аб аграрнай рэформе, паводле якога міністр сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ у сувязі з правядзеннем ссялення атрымаў права загадаць перадаць малазямельным сялянам распарцэляваную зямлю ў памеры, неабходным для іх надзялення. Загад міністра мог быць выкананы праз продаж сялянам зямлі Дзяржаўным сельскагаспадарчым банкам у тэрмін, вызначаны ў кожным выпадку асобна ў залежнасці ад існуючых абставін, але ў цэлым не менш за 3 месяцы і не больш за1 год (артыкул 15) [16].

Неабходна адзначыць, што першапачаткова камасацыя ажыццяўлялася ў Заходняй Беларусі даволі марудна з-за недахопу ў мясцовых сялян фінансавых сродкаў і будматэрыялаў на перасяленне [8, s. 449–450]. З мэтаю паскарэння хутарызацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне Міністэрства зямельных рэформ і Міністэр-

ства фінансаў [9] аб аказанні дапамогі сялянам, якія выходзілі на хутары. Дзяржаўная дапамога прадастаўлялася хутаранам у форме крэдытаў на:

1) перанясенне старых пабудоў ці ўзвядзенне новых жылых і гаспадарчых будынкаў на надзелах, вызначаных пры ссяленні;

2) правядзенне прынятай праз зямельныя ўправы сельскагаспадарчай меліярацыі: асушэнне, абвадненне, выраўноўванне і раскарчоўка зямлі, выкопванне калодзежаў і пракладванне дарог;

3) набыццё зямельных надзелаў ад іншых удзельнікаў ссялення (для ўладальнікаў карлікавых гаспадарак);

4) аплату тэхнічных работ па правядзенні ссялення, усталяванне права ўладання і ўрэгуляванне іпатэкі ссяляемых грунтоў (артыкул 1).

Дзяржаўнаю крэдытнаю дапамогаю маглі карыстацца грамадзяне ІІ Рэчы Паспалітай, не абмежаваныя судовым прысудам, пераходзячыя на новыя надзелы і не маючыя на гэта дастаткова сродкаў. Акрамя таго, такая дапамога магла быць аказана тым асобам, якія ссялялі альбо ссялілі свае землі да 21 верасня 1920 г. паводле пастаноў, што дзейнічалі да прыняцця закона ад 31 ліпеня 1923 г. (артыкул 2).

Дзяржаўная крэдытная дапамога хутаранам выдзялялася з вызначаных на гэтыя мэты фондаў Міністэрства сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ у форме дадатковых пазык пад 4% гадавых (артыкул 3). Уладальнікам наваствораных хутарскіх гаспадарак выдаваўся банкаўскі крэдыт: 1 200 (у выключных выпадках да 2 500) злотых на перанясенне будынкаў і 600 (800) злотых на меліярацыю (артыкул 4). Крэдыт выдаваўся малазямельным гаспадарам на куплю дадатковай ворнай зямлі. Высокасць пазыкі ў стасунку на 1 га новаатрыманага надзела не магла перавышаць сярэднерынкавага кошту зямлі ў дадзенай мясцовасці (артыкул 5). Агульная сума крэдыту на набыццё зямлі на 1 гаспадарку не магла быць больш за 1/2 кошту ўсёй зямлі (артыкул 6) [3, арк. 5]. Крэдыты выдаваліся пад іпатэчнае забеспячэнне нерухомасцю на тэрмін да 15 гадоў, а на тэхнічныя работы – да 4 гадоў (артыкул 9). У выпадку неўраджаю, пажару альбо іншага стыхійнага бедства, смерці альбо цяжкай хваробы хутараніна выплата крэдыту магла быць адтэрмінавана на 2 гады (артыкул 12).

Пры афармленні крэдыту на камасацыю селяніну неабходна было заплаціць першапачатковы ўнёсак, а потым кожнае паўгоддзе (1-га красавіка і 1-га кастрычніка) выплачваць суму асноўнага доўгу роўнымі долямі з працэнтамі. Гербавы збор пры гэтым звычайна складаў 7 злотых 20 грошаў, яго патрэбна было заплаціць на працягу месяца з дня пераафармлення зямлі [1, с. 137–138].

7 сакавіка 1928 г. выйшла распараджэнне прэзідэнта ІІ Рэчы Паспалітай Ігнацы Масціцкага ў справе змен выканання рашэнняў аб ссяленні зямель, паводле якога асобы, што атрымалі пры ссяленні зямельныя надзелы меншай вартасці, мелі права на грашовую кампенсацыю. Калі ж такая розніца перавышала 3% вартасці ссяляемых зямель і паміж уладальнікам і асобамі, яія праводзілі ссяленне, не была дасягнута згода, сума кампенсацыі павінна была вызначацца судовым рашэннем [13].

Паводле пастановы Міністэрства сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ ІІ Рэчы Паспалітай ад 21 красавіка 1928 г., зацікаўленыя асобы павінны ўнесці на карысць зямельных упраў па 50 грошаў за кожную абвешчаную ім старонку ў якасці кампенсацыі выдаткаў [10].

19 чэрвеня 1928 г. выдадзена сумеснае распараджэнне міністэрстваў сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ і юстыцыі, паводле якога ў выпадку неабходнасці выканання законных рашэнняў зямельных камісій у справе грашовых даплат пры ссяленні грунтоў зацікаўлены бок альбо зямельная ўправа, кантралюючая пераход выдзеленых зямель ва ўласнасць удзельнікаў ссялення, прадстаўляла рашэнне на зацвярджэнне старшыні ваяводскага суда, у тэрытарыяльнай кампетэнцыі якога рашэнне павінна было

быць выканана праз землямера альбо войта, якія павінны былі выканаць на карысць зацікаўленага боку вышэйазначанае рашэнне ва ўмовах, вызначаных законам для выканання грамадскіх судовых рашэнняў [11].

6 чэрвеня 1935 г. выдадзена распараджэнне Міністэрства сельскай гаспадаркі і сельскагаспадарчых рэформ аб кошце работ па камасацыі. Паводле вызначаных тарыфаў, плата за хутарызацыю 1 га зямлі складала: у Навагрудскім ваяводстве, Палескім, усходняй частцы Беластоцкага (Беластоцкі, Бельскі, Гродзенскі, Сакольскі і Ваўкавыскі паветы), паўднёва-заходняй частцы Віленскага (Маладзечанскі, Ашмянскі, Свянцянскі і Віленска-Троксі паветы) з памерам старога стану зямлі – 20, без памеру – 15 злотых; у паўночна-ўсходняй частцы Віленскага ваяводства (Браслаўскі, Дзісненскі, Пастаўскі і Вілейскі паветы) з памерам – 18, без памеру – 15 злотых (артыкул 1.1).

Аплату за выкананне работ па ссяленні ажыццяўляў уладальнік зямлі на працягу не больш 5 гадоў, а калі землі знаходзіліся ў карыстанні грамадскасці ці Міністэрства фінансаў – улада альбо орган, пад кантролем якога знаходзілася зямля (артыкул 4). Колькасць выплат залежала ад высокасці сумы аплаты, але штогадовыя выплаты не павінны быць меншымі за 15 злотых (артыкул 19).

Ад аплаты работ за камасацыю сяляне маглі быць вызвалены ў выпадках:

1) працяглай неплацежаздольнасці і немагчымасці самастойна аплаціць неабходныя работы;

2) адмены ссялення;

3) калі выплаты па камасацыі не перавышалі 10 злотых;

4) калі такая патрэба ўзнікала ў выніку выдаткаў на матэрыялы пры выкананні меліярацыйных работ;

5) абцяжарваючых ссяленне на пэўных абшарах (артыкул 24) [12].

Паводле ацэнак тагачасных польскіх даследчыкаў, для ажыццяўлення работ па камасацыі асобнай вёскі неабходна было як мінімум 2 гады, у першую чаргу для падрыхтоўкі неабходнай нарматыўна-прававаой і тэхнічнай дакументацыі па ссяленні і, пры магчымасці, па надзяленні дадатковаю ворнаю зямлёю мясцовых беззямельных і малазямельных сялян [8, s. 449].

**Заключэнне**

Камасацыя праводзілася польскімі ўладамі на землях Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. на падставе закона ад 31 ліпеня 1923 г., які быў потым удакладнены некаторымі пастановамі, перш за ўсё распараджэннямі Міністэрства фінансаў і сельскай гаспадаркі ад 14 студзеня 1927 г. аб выдачы сялянам, якія пераходзілі на хутары, ільготных крэдытаў і ад 6 чэрвеня 1935 г. аб кошце работ за ажыццяўленне хутарызацыі. Польскія ўлады меркавалі рассяліць на хутары як мага больш заходнебеларускіх вёсак, справядліва бачачы ў камасацыі сродак паспяховага развіцця сельскай гаспадаркі краю. Камасацыя праводзілася на аснове дэталёва распрацаванай заканадаўчай базы, яе задачаю была ліквідацыя цераспалосіцы, што перашкаджала вядзенню сялянамі асабістай гаспадаркі і замаруджвала станаўленне ў заходнебеларускай вёсцы капіталістычных адносін.

Дзякуючы ажыццяўленню ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-х гг. камасацыі, ствараліся самастойныя, рынкава арыентаваныя сялянскія гаспадаркі фермерскага тыпу, здольныя не толькі забяспечваць сябе, але і пастаўляць прадукты на рынак.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Гарады і раёны Берасцейшчыны. Гісторыя і сучаснасць. Івацэвіцкі раён / У.В. Здановіч [і інш.] ; пад рэд. А.А. Гарбацкага. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2009. – 564 с.

2. Гольдштейн, И.И. Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии / И.И. Гольдштейн. – М. : Гос. социал.-эконом. изд-во, 1940. – 296 с.

3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 60. – Воп. 1. – Спр. 1439. План работы Полесского окружного земельного управления на 1927–1928 г. и сведения об аграрном положении Полесья.

4. Зялінскі, П.І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1919–1939 гг.) / П.І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верасня 1999 года / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск : БДУ, 2000. – С. 24–30.

5. Полуян, И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И.В. Полуян. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.

6. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.

7. Dworakowski, B. Wskazówki dla scalających grunty / B. Dworakowski, E. Jasiński. – Warszawa : Drukarnia S. Sloniewkiego, 1928. – 136 s.

8. Odłanicki-Poczobutt, S. Województwo Nowogródzkie / S. Odłanicki-Poczobutt. – Wilno : Nakładem Wilenskiej Izby Rolniczej, 1936. – 498 s.

9. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 14 stycznia 1927 r. Wydane w porozumieniu z Ministrem Skarbu o państwowej pomocy kredytowej przy scalaniu gruntów // Dziennik ustaw Rzeczypospolitej Polskiej (DURP). – 1927. – № 6. – Poz. 36. – S. 45–47.

10. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych z dnia 21 kwietnia 1928 r. Wydane w porozumieniu z Ministrem Spraw Wewnętrznych o okresleniu wysokości kosztów sporządzenia odpisów orzeczeń urzędów ziemskich podlegających publicznemu ogłoszeniu w myśl cz. 1 art. 51 ustawy z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1928. – № 54. – Poz. 519. – S. 1177.

11. Rozporządzenie Ministra Reform Rolnych i Ministra Sprawiedliwości z dnia 19 czerwca 1928 r. o trzybie przymusowego wykonania orzeczeń Komisyj Ziemskich nakladających na uczestników scalenia obowiązek dopłat pieniężnych // DURP. – 1928. – № 72. – Poz. 659. – S. 1668.

12. Rozporządzenie Ministra Rolnictwa i Reform Rolnych z dnia 6 czerwca 1935 r. wydane w porozumieniu z Ministrem Sprawiedliwości o opłatach za scalenie gruntów i zniesienie służebności oraz za odrysy dowodów pomiarowych // DURP. – 1935. – № 43. – Poz. 290. – S. 746–751.

13. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 7 marca 1928 r. w sprawie zmian wprowadzonych do wykonania na gruncie orzeczeń o scalaniu gruntów // DURP. – 1928. – № 28. – Poz. 260. – S. 534–535.

14. Staniewicz, W. Matujzy Bolondziszki: wieś powiaty Lidzkiego / W. Staniewicz. – Wilno : Gebethner i Wolff, 1923. – 160 s.

15. Ustawa z dnia 31 lipca 1923 r. o scalaniu gruntów // DURP. – 1923. – № 92. – Poz. 718. – S. 1050–1056.

16. Ustawa z dnia 28 grudnia 1925 r. o wykonaniu reformy rolnej // DURP. – 1926. – № 1. – Poz. 1. – S. 2–19.

***V.P. Harmatny*** **Legislation of Comasation on the Lands of Western Belarus in 1919–1939**

The article tells about the legislation of Polish governmental comasation policy in Western Belarus in 1919–1939 to unite the dispersed peasants' land and create here farmstead. Comasation was held on the base of laws of 31 July 1923 about comasation and 14 January 1927 about credits distribution for the peasants. It assisted the development in agriculture capitalistic references and in building wealth and economically independent peasants economies.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 04.01.2012